УДК 808.26:502.12:37

Г.Ф. Швед, выкладчык

# ЭКАЛАГІЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ПРАЗ НАВУЧАННЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Topical problems of ecological education depend on measuring students' outlook which is formed on the basis of continuous ecological education in the process of teaching the Belorusian language.

У сучасным разуменні экалогія – гэта навука, якая вывучае адносіны і ўзаемадзеянні раслінных і жывёльных арганізмаў, а таксама жыццядзейнасць біялагічных сістэм больш высокага рангу, іх прадукцыйнасць і энергетыку.

На Беларусі асобныя галіны экалогіі развіваюцца з 20-х гг. XX ст. Пытанні агульнай экалогіі разглядаюцца і распрацоўваюцца ў НАН Беларусі (інстытуты эксперыментальнай батанікі, заалогіі, геахіміі і геафізікі, генетыкі і цыталогіі, Цэнтральны батанічны сад і інш.), БДУ, Гомельскім дзяржаўным універсітэце, БДТУ, навукова-даследчых інстытутах і лабараторыях, запаведніках і ландшафтных заказніках.

Хуткае развіццё экалогіі ў цяперашні час абумоўлена агульнымі поспехамі навукова-тэхнічнага прагрэсу і імгненна нарастаючымі зменамі ў навакольным асяроддзі. Разам з іншымі навуковымі дысцыплінамі экалогія прызвана прадухіліць крызісныя сітуацыі ва ўзаемаадносінах чалавека з навакольным прыродным асяроддзем, выпрацаваць прынцыпы бесканфліктнага развіцця гэтых узаемаадносін.

На сённяшні дзень у свеце існуе шмат экалагічных праблем, пачынаючы ад знішчэння некаторых відаў раслін і жывёл і да пагрозы выраджэння чалавечай расы. На дадзены момант ёсць шмат тэорый, у якіх вялікая ўвага надаецца пошуку найбольш рацыянальных шляхоў вырашэння гэтых праблем.

Прырода Беларусі вызначаецца своеасаблівай прыгажосцю, аснову якой складаюць маляўнічыя ўзгоркі, густыя лясы, блакітныя азёры і рэкі.

Наша краіна з'яўляецца адной з самых лясістых тэрыторый Еўропы. Лясы займаюць 37,8 плошчы краіны.

Балотныя і водныя экасістэмы займаюць значную частку тэрыторыі і з'яўляюцца разам з лясамі каштоўнай уласнасцю рэспублікі. Жывёльны свет Рэспублікі Беларусь багаты і разнастайны. Ёсць у краіне і карысныя выкапні.

Экалагічная палітыка Рэспублікі Беларусь, яе нарматыўная прававая база, экалагічныя механізмы прыродакарыстання пастаянна ўдасканальваюцца. Гэта стварае перадумовы рэалізацыі права сучаснага і будучага пакаленняў грамадзян краіны на спрыяльнае навакольнае асяроддзе.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь дэкларуе правы кожнага грамадзяніна на спрыяльнае навакольнае асяроддзе і на кампенсацыю шкоды, прычыненай парушэннем гэтага права. Першым з прырода-ахоўчых законаў у незалежнай Беларусі быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове навакольнага асяроддзя» ў 1992 г. (дапрацаваны ў 2002 г.).

Відавочна, што экалагічная адукацыя павінна мець прыярытэтнае значэнне і пачынацца з самага ранняга ўзросту.

У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь адзначана: «Ахова прыроднага асяроддзя – абавязак кожнага». На практыцы мы бачым, што многія праблемы цяперашняга стану навакольнага асяроддзя вельмі звязаны з узроўнем экалагічнай свядомасці народа.

У гэтым плане ўжо нямала зроблена. Праводзіцца мэтанакіраваная работа па адукацыі насельніцтва. Для гэтага сумесна з Міністэрствам асветы праводзіцца работа па арганізацыі сістэмы бесперапыннай экалагічнай адукацыі, якая ўключае дашкольную, школьную, прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную, вышэйшую адукацыю.

У БДТУ на занятках па беларускай мове шмат увагі надаецца экалагічнаму

выхаванню. Падбіраюцца тэксты, сказы, тэмы вуснага маўлення, накіраваныя выхоўваць у студэнтаў экалагічную культуру, любоў да Радзімы, да яе прыроды.

Для студэнтаў I курса ЛГФ у час навучання ў Негарэльскім вучэбна-вопытным лясгасе (I семестр) выкладаецца дысцыпліна «Экалогія з асновамі метэаралогіі» на беларускай мове. Пры кафедры беларускай мовы створаны экалагічны гурток, большую частку ўдзельнікаў якога складаюць студэнты ЛГФ. Кожны год сярод іх праводзіцца конкурс рэфератаў, прысвечаных экалагічным праблемам. Традыцыйнымі сталі заняткі ў музеі экалогіі і прыроды Рэспублікі Беларусь.

Сёння для кожнага чалавека абавязковыя асновы экалагічнай культуры: веданне правіл абыходжання з прыродай, уменне і гатоўнасць жыць па гэтых правілах. Можна спадзявацца, што правядзенне розных мерапрыемстваў на экалагічную тэму дазволіць прыцягнуць да экалагічнага руху шырокія пласты насельніцтва рэспублікі.

ЛІТАРАТУРА

1. Окружающая среда и ее охрана / И.Р. Голубев, Ю.В. Новиков. – М.: Просвещение, 1985.
2. Природа и человек. – М.: Просвещение, 1991.
3. Материалы республиканского экологического форума. – Орша, 2003.